Мерапрыемства, прысвечанае 100-годдзю Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прайшло ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Такая інфармацыя змешчана на сайце Міністэрства культуры Беларусі. Маскоўскаму гледачу прадстаўлены фотапраект «Нацыянальная бібліятэка Беларусі: учора, сёння, заўтра», які дэманструе архіўныя і сучасныя мастацкія фотавобразы, сабраныя спецыяльна да юбілею. Індывідуальныя стыль і почырк фотамастакоў дазваляюць убачыць мінулае, сучаснасць, будучыню Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праз прызму творчага ўяўлення аўтараў. Святочную атмасферу мерапрыемству надалі выступленне студэнткі Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры Кацярыны Калацілкінай і канцэрт заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь вакальнага ансамбля «Камерата» Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Пазней фотавыстаўка будзе дэманстравацца ў беларускім павільёне на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі г. Масквы і дазволіць шырокай аўдыторыі атрымаць больш поўнае ўяўленне аб галоўнай бібліятэцы Беларусі.